Наша доля

Рэспубліканская штотыднёвая газета
Выдаецца з верасня 1990 г.

№ 37 (146)
15 верасня 1994 г.
Кошт у розніцу — 25 руб.

ИНИЦИАТИВА И ПРЕДПРИИМЧИВОСТЬ

Львята, которых ждут в Бельгии

Беседа, которую я предлагаю читателям, не о зверинце. Год назад в Московском районе города Минска начало свою деятельность предприятие «Тролль», которым руководит Людмила Петровна Шапурина. Инженер, сменившая кульман на сварочный аппарат, активная участница строительства БАМа, которому отдала 15 лет своей жизни. Оставила там свои огненные автографы прочности на трубах теплотрасс, котлах высокого давления, ремонтировала машины и отопление. Словом, героическая трудовая биография у женщины, энтузиазм, молодость и настойчивость которой преодолели все трудности суровой таежной жизни. И вот теперь такой неожиданный поворот -- директор предприятия общества инвалидов. И первый мой вопрос Людмиле Петровне:

-- Где же ваш кабинет?

— Здесь, в собственной квартире. Увы, пока другого помещения нет, ищем. Приходится и работать, и считать, вести телефонные разговоры, давать указания, а то и принимать посетителей. Надеюсь, что трудности временные.

— Как же зародилось само предприятие -- долго вынашиваемая идея, личная инициатива или...?

— Пожалуй, одна из главных причин -- тяжелое положение инвалидов. Попробуйте содержать семью из четырех человек, трое из которых — дети, к тому же один — инвалид. Работать --другой альтернативы нет. Держали семейный совет. Так и пришли к игрушкам, которые изготовили сами. Показали в обществе инвалидов -- понравились, потом пригласили на выставку. Так вот и начали. Ну, а что касается названия «Тролль», то это вовсе не дань нынешней моде -- дать крикливое иностранное имя. Это имя лесного человека — персонажа из детской сказки.

— Форм собственности сейчас предостаточно. К какой из них следует отнести ваше предприятие?

-- К общественной, но у нас все, как на нормальном государственном предприятии: производственные площади, швейные машины, иструмент, сырье. Цех находится в помещении, арендуемом на одном из заводов. В нем всего девять работниц, остальные 26 человек -- надомники.

— Как же вы готовили кадры?

— Принимали людей на конкурсной основе, затем -- платное обучение в течение двух месяцев и экзамен. Впрочем, в процессе работы было видно, кто и на что способен. Теперь у нас трудятся раскройщицы, швеи и сборщицы. Есть даже технический контроль -- ведь всякое уважающее себя и покупателя предприятие должно заботиться о чести своей марки. Так что брак у нас — редкость, скорее исключение из правила.

— Какой же ассортимент вашей продукции?

-- Более двадцати наименований мягких игрушек: собака большая, собака в ботинках, собака Плутон (та, что из мультиков), динозаврики, гориллы, слоны, зайцы, еноты...

— Прямо-таки целый зоопарк!

-- А еще Ниндзя, Микки-Маус. Самая большая игрушка едва ли не метр ростом. Аналогичной продукции наши игрушки уступают только в цене: дешевле в несколько раз. Я думаю, это хороший показатель.

-- В таком случае, игрушке просто необходима реклама.

-- Кстати, о рекламе. Накануне Нового года в моей квартире велась телесъемка. Представьте себе, едва разместили игрушки. Мы тогда только недавно зарегистрировались как предприятие. Наверное, поэтому передачу не торопились запускать в эфир: мол, посмотрим, как покажут в работе. Честно признаюсь: не думала, что передачу «Между нами, женщинами» смотрит так много зрителей, в итоге -- звонки мне и на телевидение, в том числе и от инвалидов. Так что реклама была.

— Людмила Петровна, не доводилось видеть, как изготавливается мягкая игрушка. Уверен, что я не одинок в подобном неведении. Читателям будет интересно узнать об этом.

-- Во-первых, на изготовление мягкой игрушки идет искусственный мех очень сочных и ярких расцветок, красивая фурнитура, говоря техническим языком, а это пластмассовые глаза и носики. Девушки, которые трудятся в цехе, выполняют свою работу творчески и с фантазией. Мех мы получаем из Жлобина, и его нам хватает.

— А что значит такая работа для инвалидов?

— Прежде всего это ощутимая прибавка к пенсии, хотя мне кажется, что для многих немаловажно моральное удовлетворение, в особенности тем, кому эта работа по душе. У нас ведь специализация, и есть инвалиды, которые, например, шьют только шкуру зверюшки, и я часто наблюдала, как они радуются встрече с готовой игрушкой. Ну, и зарплата, если на совесть поработать, больше пенсии.

-- В таком случае устроиться на работу в «Тролль» -- проблема для многих инвалидов?

-- Вовсе нет. Мы принимаем всех, ведь люди работают на дому. У нас, между прочим, даже трудятся инвалиды, живущие в других районах Минска. Правда, есть мнение, что желательно отдавать предпочтение нашему району, но как я могу отказать звонившей мне матери, у которой дочь — инвалид?

— Не столь важна география, сколько совпадение интересов? Людмила Петровна, представляете, сколько к вам будет обращаться людей после появления этой беседы в газете. Примете?

-- Работой-то мы обеспечим, но ведь надо овладеть профессиями, добиться качества, только тогда и придет успех.

-- Какие у предприятия трудности?

— Грядет зима, а условия для работы едва не сезонные. И дело не в метраже, а в тепле. Потому и озабочены поиском помещения. В остальном удары этого дикого рынка мы пока сдерживаем. Да и люди работают с охотой. Есть, как говорится, на кого равняться. Я бы отметила Николая Николаевича Костикова, Татьяну Жданович, Людмилу Соловьеву, Курс Валентину Николаевну, Рыбкину Нину Александровну. Хороших работников много.

Во время нашей беседы Людмила Петровна сообщила о заказе на мягкую игрушку из Бельгии. Естественно, новость вызвала большой интерес.

— Мы сотрудничаем с предприятием «Довано», которое выпускает ковры и покрытия. Однажды поставщик из Бельгии взглянул на наши игрушки, и они ему приглянулись. Он увез с собой образцы, которые затем успешно прошли экспертную комиссию. И вот получен заказ на изготовление партии симпатичных львят, которых теперь ждут от нас в Бельгии. Готовимся к выполнению. Ждем ответа от израильской фирмы, куда тоже послали образцы.

— Выходит, несмотря на очень короткую трудовую биографию предприятия, на своем рынке вам уже вроде тесновато.

-- Ну что вы, это пока дело случая. Хотя у нас побывали уже представители из Нижнего Новгорода, Белой Церкви (Украина), Санкт-Петербурга.

— Какие же перспективы у «Тролля»?

— Надо расширяться, увеличивать выпуск продукции, а также зарплату людям, ведь жизнь дорожает почти с каждым днем, за ценами не угнаться.

— Где же в нашей республике покупатели могут приобрести ваши игрушки?

-- В Минске -- это ГУМ, магазины «Рига», «Вероника», предприятие «Богатель» и другие. И еще в Гродно, за пределами республики — в Санкт-Петербурге.

— А вам лично ваша продукция нравится? И потом, увлекает ли мягкая игрушка ребенка, с ней интересно играть?

-- Конечно. При этом ее можно подбрасывать -- она очень легка. Кстати, для сведения покупателей: наши игрушки проходят апробацию и на возгорание, и на разрыв.

— То есть того же самого льва малыш может потаскать даже за хвост?

Директор от души смеется шутке, рассыпая на столе большие пластмассовые зеленые, синие, черные, бордовые глаза, предназначенные для зверюшек, черный рот обезьяны, который походит на сердечко.

— Да, наши игрушки довольно долговечны, чтобы выдерживать разные детские шалости. Конечно, хотелось бы их удешевить, но, к сожалению, это не зависит теперь от нас. И все же я бы посоветовала их покупать -- и не только для детей. Удивительно, но даже мужчины дарят такие подарки женщинам!

Узнав, что Людмиле Петровне предстоит командировка в Алма-Ату (пригласили принять участие в выставке детской игрушки и, наверное, там будет подписание договоров о поставке), я поблагодарил ее за интересный рассказ и пожелал удачной поездки.

Ну, а что касается Бельгии, то заказанные три тысячи львят она непременно получит. Да иного и не может быть: белорусское предприятие инвалидов «Тролль» свое обещание выполнит.

Беседовал
Вячеслав Гилевич, г. Минск

ПОДПИСКА

Знакомство состоится

Районный отдел БелОИ Каменецкого района, несмотря на финансовые трудности, все же изыскал возможность оказать членам общества инвалидов денежную помощь на подписку газеты "Наша доля". В четвертом квартале читателей у "Нашей доли" среди местных жителей станет больше на 60 человек, причем многие из них познакомятся с газетой впервые. Большая заслуга в этом, конечно же, первичных организаций БелОИ, да и самого коллектива редакции газеты, который старается делать еженедельник интересным и доступным.

М. Мамус, инв. СА II-й гр., Каменецкий р-н

Сёння заканчваецца падпіска на штотыднёвік "Наша доля" на IV квартал 1994 г.
Але ў Вас яшчэ засталося некалькі гадзін, каб запоўніць змешчаны ў газеце падпісны купон і аднесці яго ў бліжэйшае аддзяленне сувязі. Паспяшайцеся, каб газета і далей была Вашым слушным дарадчыкам і надзейным спадарожнікам.
Нагадваем: падпісная цана "Нашай долі" на 3 месяцы -- 420 рублёў.

АБОНЕМЕНТ на газету **63866**
(индекс издания)
«Наша доля»
(наименование издания)
Количество комплектов
на 199___ по месяцам:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куда
(почтовый индекс) (адрес)
Кому
(фамилия, инициалы)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА
ПВ | место | литер
на газету **63866**
(индекс издания)
«Наша доля»
(наименование издания)

Стоимость	подписки	___ руб. ___ коп.	Количество комплектов
	переадресовки	___ руб. ___ коп.	

на 199___ по месяцам:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куда
(почтовый индекс) (адрес)
Кому
(фамилия, инициалы)

ЗДРАДА

У свой час гэту вёску прызналі неперспектыўнай. Цяпер ужо новая перспектыва адабрала апошняе...

Экзістэнцыялісты сцвярджалі: чалавек прыходзіць у жыццё фатальна адзінокім, потым валачэцца па гэтай зямлі, сам не ведаючы дзеля чаго, і памірае, так і не пазбавіўшыся ад накладзенага праклёну: "Я адзін у свеце". Панурая філасофія аказалася такой блізкай тым, захад чыйго жыцця супаў з захадам 20-га стагоддзя. І вандруючыя па свеце энергічны "амерыканскія бабулі" ў квяцістых шортах усяго толькі напамінак: жыццё можа складацца не толькі з чэргаў за таннай каўбасой... Жыццё бывае іншым. Але не лёс...

Вёска Залессе, што на Пухаўшчыне, была калісьці шматлюднай, галасістай. На доўгія вякі стараліся віць свае гнёзды тутэйшыя жыхары. Адбудаваўшыся, выхваляліся адзін перад адным сваім багаццем. У аднаго хата на пяць вуглоў, у другога — пасека на 20 пчаліных калод, у трэцяга ж — раскошная баня з бярозавымі венікамі і халодным хлебным квасам.

Баяўся не адстаць ад вяскоўцаў у гэтым плане і Баніфацый Іванавіч Рыпінскі. Хоць і інвалід (стаў ім пасля ранення ў гады Вялікай Айчыннай вайны), а такі маёнтак сабе адбудаваў, што дзіву людзі даваліся. Было ў Баніфацыя Іванавіча і яшчэ адно прызванне. На яго 50 прысядзібных сотках у любую непагадзь бульба і ячмень радзілі.

— Напэўна ты, Іванавіч, чаруеш над зямелькай, — не раз падтрунівалі ветэрана вяскоўцы. — Робім усё, як і ты, а ячмень у нас — не такі каласісты, і бульба неўмалотная.

— Сакрэт у мяне адзін, — заўсёды сур'ёзна ставіўся да такіх размоў Баніфацый Іванавіч, — зямелька рукі любіць.

І, сапраўды, нібы малое дзіця, песціў былы франтавік сваю зямельку. З ранку да вечара і ўлетку, і ўзімку корпаўся на ёй. Можа таму, што зямля гэтая — адзінае, што ў яго было. Абзавесціся сям'ёй ён у свой час не паспеў: забралі на вайну, ну а калі ж вярнуўся, ніхто з вясковых жанчын так і не адважыўся пайсці за інваліда. Так і жыў бабылём.

Ад хутка надышоўшай старасці, а разам з ёй пакут і хвароб — ратавала яго ўсё тая ж зямелька. Не ведае Баніфацый Іванавіч, як бы ён без яе выжыў, не здзічэў, калі раптам абязлюдзела вёска пасля таго, як аб'явілі яе неперспектыўнай. Не пакінулі свае сядзібы толькі старыя і нямоглыя. Не здрадзіў сваёй зямельцы і Баніфацый Іванавіч.

— Тут нарадзіўся, тут і памру, — наадрэз адмовіўся ад пераезду ветэран.

Напачатку, звычайна па святах, да старых пустэльнікаў, а было іх усяго некалькі чалавек, наязджалі то старшыня мясцовага калгаса, то старшыня сельскага Савета. Над закалочаным сельскім клубам прыбівалі сцяг, уручалі ўсім святочныя паштоўкі, нават аб здароўі спраўляліся. А калі і падарункі прывозілі. Адным словам, клапаціліся аб старых. Можа б яно і зараз так было, калі б не пазачынялі райкомы, не развалілі Савецкі Саюз. За ўвесь той час, калі ўсё гэта тварылася, залескія пустэльнікі амаль што ўсе памерлі. Толькі і засталіся ў вёсцы 86-гадовы Баніфацый Іванавіч Рыпінскі, яго 90-гадовая сястра Мальвіна Іванаўна і састарэлы В. К. Сабалеўскі. Да іх ніхто ўжо не прыязджаў, ніхто не наведваў. З аднаго боку, думаў Баніфацый Іванавіч, гэта і добра. Можа і ўдасца спакойна дажыць свой век у гэтым глухім куточку. Але дзе там...

У тую ноч стары доўга не мог заснуць. У галаве мроіліся розныя трывожныя думкі. Стараўся гнаць іх ад сябе, але сэрца ныла і ныла. Падняўся, як толькі пачало шарэць неба. Нацягнуў на ногі даўно стаптаныя кірзачы, накінуў на плечы ватоўку і падаўся на агарод. Тут і ўбачыў жудасны малюнак: засеянае ячмянём поле ўшчэнт было перапахана. У каго ж паднялася рука зрабіць такое?



Ад такога ўдару доўга не мог стары адысці. Як крыху ачуняў, напісаў скаргу ў Пухавіцкі райвыканкам. І вось атрымаў нарэшце адказ. Доўга не мог паверыць сваім вачам, чытаючы гэтыя радкі: "На вашу заяву, накіраваную ў райвыканкам, паведамляем, што рашэннем Пухавіцкага райвыканкама і Краснаакцябрскага сельскага Савета ўчастак плошчай 0,40 га перададзены ў пажыццёвае спадчыннае валоданне фермеру У. С. Доўнару пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва.

Загадчык аддзела па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню В. А. Якушаў".

І ўсё ж не паверыў стары напісанаму. Доўга праўду шукаў. Але ўсё дарэмна. Прасіў і гэтага самага фермера, а дакладней, былога галоўнага агранома РАПА, адмовіцца ад яго зямелькі. Але Валерый Сідаравіч і слухаць старога не стаў. Адно параіў: папрасіць, каб выдзелілі яму гэтыя 40 сотак у іншым месцы. Наўрад ці не разумеў былы аграном, што не ў гадах Баніфацый Іванавіч пачынаць з нуля.

Ды і не ў сотках справа. Трасца з ёй, з гэтай зямлёй! Перажыў жа вайну, абыдзецца неяк і без агарода. Хіба старому многа трэба? Вось толькі як перажыць гэтую знявагу, гэтую здраду? Здрадзілі ж тыя, за шчаслівае будучае каго ён ваяваў, не даядаў, не дасыпаў, да сёмага поту працаваў на сваёй зямельцы. Логіка такая: маўляў, не прыватызаваў своечасова зямлю —абрэзалі надзел. Вось так, здрадзіць — усяму святому і дарагому — як гэта, аказваецца, проста.

І як балюча!

Ж. Уласава,
наш кар.

ФАКТ

Колхозный санаторий? Это интересно

В колхозе "40 лет Октября", что в Каменецком районе, когда-то, еще в лучшие времена, был построен санаторий "Лесной". В те годы обслуживал он в первую очередь, конечно же, своих тружеников. А через некоторое время стал принимать на отдых и лечение за умеренную плату и жителей других окрестностей. А еще позднее один из корпусов этого лечебного заведения был перепрофилирован для оказания лечебных услуг и инвалидам, причем с поврежденными нижними конечностями, полностью прикованным к постели. В санатории "Лесной" они получили возможность самостоятельно в колясках передвигаться в душ, спальные комнаты, столовую, процедурные кабинеты.

Ежегодно в санатории, особенно в летний период, инвалидов бывает очень много. Приезжают они и из Бреста. Горожане говорят, что им здесь очень нравится. Правда, неизвестно, как долго будет функционировать этот санаторий. Поговаривают, что правление колхоза намеревается его продать. И нет уверенности в том, что инвалиды смогут там по-прежнему отдыхать и лечиться. А терять такое заведение очень и очень бы не хотелось.

ЧЫТАЧ — ЧЫТАЧУ

Памідоры — круглы год

Вырошчваю я іх на падаконніках у звычайных кветкавых вазонах. Расліна самаапыляецца і перыядычна дае смачныя плады. Такія вось "вечныя" памідоры вырошчваю ўжо некалькі год. На каліве завязваецца па 5—8 памідорчыка, і вырастаюць яны велічынёй з грэцкі арэх, нават больш. Даглядаю расліну, як і звычайныя хатнія кветкі.

Размножыць гэтыя памідоры вельмі проста. Стаўлю ў ваду парастак, а са з'яўленнем карэньчыкаў высаджваю ў вазон.

Цуда-памідоры падарыла мне батанік Вера Мікалаеўна Мікалаева. Дарэчы, нядаўна яе не стала. Як памяць аб гэтай жанчыне і засталася гэтая расліна. Калі кагосьці вырошчванне такіх памідораў зацікавіць, магу падзяліцца насеннем і парадамі.

М. М. Мамус, інв. СА ІІ-й гр., 225063, Брэсцкая вобл., Камянецкі р-н, п/а Камянюкі

Мікола Капыловіч

Перад вечнасцю Бацькаўшчыны

— Нататкі пісьменніка —

На кустах яшчэ паблісківаюць гронкі парэчак. Ступіў паўз загончык — і цэлыя прыгаршчы назбіраў садовых суніц. А канец жа жніўня... Прыгледзеўся да вішняку і ўбачыў з дзесятак ягад, якіх не паспелі абцерабіць шпакі. А яблык... Куды ні зірні — жоўтымі пляцёнкамі звісаюць да самай зямлі, так і просяцца ў рукі:

— Мяне!

Пайшоў на агароды, ступіў на абвялую на сонцы атаву, зірнуў перад сабою на зялёна-блакітны далягляд — і перахапіла дыханне:

— Божа! Усё ж гэта магло быць заўсёды са мною! Гэтая цішыня... Гэты духмяны туман над рэчкаю, гэтая драча на поплаве. Гэтае неабсяжнае неба, на якім вось-вось прарэжуцца зоркі. Усё гэта і ўсё іншае, на чым трымаецца жыццё, чаму адклікаецца сэрца, усё, што прызначалася мне, павінна было стаць маім і са мною да майго апошняга дня, а стала амаль чужым. А лепш сказаць, чужым, выпадковым усяму гэтаму зрабіўся я сам. "Хіба толькі не па сваёй волі", — апраўдваюся. Але тут жа спыняю сябе: "Чаму гэта не па сваёй! Па сваёй!" Ды вось не вярнуўся, і цяпер апраўдваюся, шукаю тлумачэнні, якіх няма. Я думаю цяпер, што па сваёй сутнасці, па сваіх цяжкасцях жыццё вёскі за гэтыя дзесяцігоддзі мала змянілася. Хіба наеліся хлеба, ды і таго ачарсцвелага.

Вось і маці няма, і бацькі, і шматлікіх маіх аднагодкаў... Спрацаваліся на палетках, падарвалі здароўе і памерлі. А другое жыццё... Дзе ты да гэтага часу блукаеш, іншае жыццё? Чаму ніяк не адшукаеш сцежку да маёй вёскі. Мо тым пылам, што слаўся за мной, калі пакідаў родную хату, зацерусіла цябе, як сівізной памяці?

Жыццё тут некалі павярнулася так, што і зямля, і ўсё, што было на ёй, што стагоддзямі палівалася крывёю і потам, адкладвалася на капейкі і недаядалася, стала агульным, а значыцца нічыім, і селянін у гарачую пару, каб неяк пракарміць сям'ю, ідзе на лесасплаў і ў леспрамгас. Як жыць, калі ўсё, што дае зямля, — не тваё, і нават тое, што тваё, — не тваё.

Пайшла маці на калгаснае поле, вечарам ледзь прыцягнулася дамоў, убачыла: замок з дзвярэй пограба збіты, і бабуля, якая тады жыла з намі, расказала, плачучы, як да іх прыйшлі нейкія мужыкі і забралі толькі што выкапаную бульбу.

— Што ж есці будзем? Дзеці малыя апухлі з голаду, — спытала ў ніх бабуля.

— Хто не памрэ, той будзе жыць, — адказалі яны.

— Як жыць? — няўцямна хітала галавою маці на другі дзень, выціраючы сухія чырвоныя вочы. — Даруй мне, Божа, за дурныя думкі: хацела ноччу рукі на сябе накласці. І лягчэй было б, але ты, сынок, утрымаў. Падумала: "Як жа ён без мяне жыць будзе? Да каго прытуліць галаву, каму будзе патрэбен, калі маці яго пакінула на белым свеце? Не адна ж ты такая".

І жылі. Галадна і холадна. Рвалі апошнія жылы на падатках. Не дай бог — нядоімкі. А дзе яе ўзяць, капейчыну, калі працавалі "за палачкі". Толькі з кірмашу. А што на ім можна прадасці, калі нічога няма ў гаспадарцы?

І нават потым, калі жыццё быццам бы трохі палепшылася і пачалі прызначаць калгаснікам пенсіі, у вяскоўцаў яна аказалася самай нізкай. Гэта за ўсю іх цяжка-пакутлівую і дармавую працу на дзяржаву. Хто падлічыць, колькі іх, пакрыўджаных хлебаробаў, паклала свае галовы на тых "просторах Родины чудесной", пра якія гучна спявалі чорныя талеркі рэпрадуктараў, хто ад голаду і холаду, а хто і "ворагамі народа", высланымі на тыя ж самыя прасторы за тое, што маглі працаваць і гаспадарыць.

Што і казаць, для выгадаваных ў вёсцы, дзе б ні былі потым, яна застанецца з намі і будзе жыць ва ўсіх нашых снах. А пазней, у канцы жыцця, сярод шматлікіх страт самай большай стратай будзе родная вёска.

І пазіраючы на родныя далягляды, што цяпер ляжалі перад маімі вачыма ў ціхім перадвечаровым харастве, я зноў і зноў думаў, што гэта магло быць са мною кожны божы дзень, магло стаць маім жыццём, магчыма — і нават пэўна — больш цяжкім, а стала толькі шчаслівым імгненнем, як кропелькаю, якая ўпала з неба. Але я дзякую табе і за гэта, мая вёска. І, калі ласка, прабач заблуднага сына.

Калі дарога прыводзіла мяне ў гэты богам падораны кут, у родную хату, зямля, простыя на ёй клопаты і ўсё, што ляжала навокал, напаўнялі душу нейкім здзіўляючым шматгалоссем. Палова, а магчыма, і больш з усяго, што я напісаў, закіпала слязьмі і ўтрапеннем менавіта тут, двума-трыма словамі клалася на нейкі шматок паперы, які часцей за ўсё губляўся. А потым гэтае ўтрапенне прыходзіла як творчае адкрыццё, як наталенне смагі, а магчыма, і як другое нараджэнне.

Усё, што было ў вёсцы карэнным, дажывае цяпер само па сабе, адсыхае, як апошнія галіны на састарэлай яблыні, без каня, які асцярожна бярэ сваімі мяккімі губамі з далоні кавалачак хлеба, без песень, якія пад шапаценне верацяна я слухаў ледзь не кожны зімовы вечар, без бабульчынай казкі.

Як ні кліча яна да сябе маладых новымі дамамі, пабудаванымі спецыяльна для іх, а палова гэтых дамоў так і застаецца неабжытымі. Толькі ўлетку ненадоўга ажываюць.

Дзеля чаго яны павінны сюды вярнуцца? Дзеля зямлі, якая зноў набыла гаспадара, дома для сына, перасыпанага з дома бацькі, які дастаўся па спадчыне, а не выкупленага ў сельсавеце? А можа дзеля ўсведамлення, што без зямлі немагчыма жыццё, а жыццё вёскі немагчыма без нашага да яе вяртання?

Крыніцы засмечваюцца, калі іх не ачысціць нечая рука або вясновая паводка. Сады дзічэюць і — заглушаныя быльняком — выраджаюцца, перастаюць быць садамі, калі ў двары няма гаспадара. Неўзаранае поле зарастае пустазеллем і забывае пах жыта.

"Мы яшчэ жывыя!" — крычаць яны з узгоркаў, асвечаныя сонцам і радасцю лета. Але цень захаду ўжо падкрадаецца да іх. "Вы чуеце: мы яшчэ жывыя! — клічуць яны нас. — У вас яшчэ ёсць да каго і да чаго вярнуцца!"

Спрачайцеся, не верце — толькі ёсць яно на свеце, шчасце, ёсць. "Вось яно!" — думаю я кожны раз, калі з дарогі, не заходзячы ў родную хату, кідаю на ганак свой гарадскі пінжак, гэтак жа рыўком — нага аб нагу — сцягваю з ног каля парога свае чаравікі і, як у далёкім дзяцінстве, босы, апякаючыся крапівою, іду ў сад, ступаю па добрай і доўгачаканай зямлі, і душа мая ахутваецца вялікай радасцю. Пры гэтым прыгадваюцца барадулінскія радкі:

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець
І не страціць святое штосьці.





Уваходзь у светлы храм з надзеяй і любоўю...
Фота Я. Пясецкага

ЧТО ГОВОРЯТ, ЧТО ПИШУТ...

Злоключения снежного барса в Польше

"Газета Выборча", Польша

Длинный пушистый хвост, дивные черные пятна. Удивительная шкура одной из самых таинственных кошек — снежного барса. Но почему в центре Варшавы — за тысячи километров от снежных вершин Гималаев, где родной дом этого чудного создания? В витрине магазина...

— Откуда? Ведь снежный барс занесен во все Красные книги! —восклицает журналист.

— Все получаем с базы, — отвечает экспедитор.

Журналист звонит в министерство охраны окружающей среды. Через некоторое время снова идет в тот магазин. Барса уже нет.

— А что с той кошкой?

— Моль съела, — с усмешкой отвечает продавец.

С тех пор, как распался Советский Союз, Польша стала огромным полем притяжения для исчезающих видов животных. Хотя их провоз через границу и продажа в стране нелегальны.

...Более 800 лет назад буддист Миларэпа отправился на медитацию в одну из гималайских пещер. Вскоре ее занесло снегом. И когда через полгода сюда пришли ученики Миларэпы, то увидели: учитель превратился в снежного барса. Так гласит легенда.

Летом снежные барсы,или ирбисы, поднимаются на высоту до пяти с лишним километров, хотя лучше всего чувствуют себя на уровне трех километров. Они прекрасно приспособлены к трудным высокогорным условиям: могучая грудная клетка, позволяющая упорно карабкаться вверх, широкие лапы не дают проваливаться в снег. Зимой мех спасает барса от мороза, а метровым хвостом он укутывает себя во время сна и отдыха.

Увы, красота губит зверя. Ученые предполагают, что в горном поднебесье живет сегодня около пяти тысяч снежных барсов. Не исключено, что эта цифра завышена. Во всяком случае, по мнению исследователей, рассеянная по громадной территории — 2,5 миллиона квадратных километров — небольшая популяция имеет мало шансов выжить.

Жители гималайских деревень подкладывают яд, устраивают ловушки — охота на ирбиса окупается. За одну шкуру они могут получить до 200 долларов, а для обитателя высокогорья это почти годовой заработок.

Рассказывает студент из Англии, который проходит практику в Беловежской пуще: "Однажды в местном ресторане увидел даму в шубе из меха ирбиса. У нас носить такую шубу запрещено. Чтобы сшить ее, нужно больше десятка барсов!"

Польша в 1990 году подписала конвенцию о международной торговле вымирающими видами, которая запрещает торговлю живыми животными, их шкурами, перьями, яйцами птиц. Но вот беда: в стране так и не сумели выработать конкретных инструкций на этот счет. Нарушители не опасаются ни полиции, ни таможенников. И появляются в витринах магазинов в центре Варшавы шкуры этих таинственных кошек со снежных вершин Гималаев.

Варшава.
Леонид Корнилов.

ГЕРОИ И ПОДВИГИ

Поймать и обезвредить

Это было в районе деревни Пески Калининской (ныне Тверской) области. Командованию стало известно, что в тыл наших войск гитлеровцы забросили диверсантов, прошедших специальную подготовку в эсэсовской школе Германии. Поймать и обезвредить опасных лазутчиков поручили лейтенанту Георгию Белевичу —кадровому военному, которого хорошо знали в части. Он отличился еще в боях под Москвой.

Белевич подобрал четверых бойцов, ознакомил их с полученной задачей.

На рассвете группа прибыла в указанный район.

Установив, что немецкие парашютисты приземлились на заболоченной местности, поросшей мелколесьем, примерно в двух километрах от населенного пункта Пески, лейтенант решил устроить засаду. Искать диверсантов на месте приземления не было смысла — фашисты могли обнаружить и перестрелять наших воинов.

Внимание Белевича привлек крайний дом, к которому вела из леса единственная полевая дорога. Здесь-то и обосновался командир. Бойцы залегли поблизости, ведя неослабное наблюдение за дорогой и домом.

Под вечер из леса вышло трое фашистов. Осмотревшись, они поспешили к дому. Когда немцы освоились с обстановкой, убедились в своей безопасности и стали развертывать радиостанцию, лейтенант подал условный сигнал бойцам и с пистолетом в руках выскочил из укрытия, громко скомандовав: "Хенде хох!"

Захваченные диверсанты, их оружие, радиостанция и шифры, топокарты и крупная сумма советских денег вскоре были доставлены в штаб.

За умело проведенную операцию Командующий фронтом генерал И. С. Конев наградил Белевича орденом Красной Звезды. Его бойцы удостоились медали "За боевые заслуги".

Мужественному, находчивому командиру поручались важные и ответственные боевые задания. Каждое из них Белевич стремился выполнить наилучшим образом.

В начале сорок третьего года ему поручили сформировать группу снайперов.

Январской ночью Белевич вместе с сержантами Логиновым, Гулyниным, Макарюхой, младшим сержантом Репкой, красноармейцами Ариповым и Бородиным вышли на передний край. Оборудовали огневые позиции, тщательно замаскировали их.

— Наши окопы находились метрах в двухстах от немецких траншей. Мы хорошо видели передвижения противника. Гитлеровцы пренебрегали средствами маскировки, — вспоминает Георгий Петрович.

Изучив обстановку, снайперы приступили к действиям. Лейтенант приказал в первую очередь уничтожать вражеских офицеров, наблюдателей, связистов.

На склоне высоты показался фашист с биноклем. В оптический прицел своей снайперской винтовки Белевич увидел офицерские погоны на шинели гитлеровца. "Птица важная", — произнес лейтенант и плавно нажал на спусковой крючок. Немец, взмахнув руками, упал. К нему почему-то никто из фашистов не подошел. С наступлением темноты двое снайперов подобрались к убитому, изъяли документы, бинокль и пистолет. Оказалось, что Белевич уничтожил командира артиллерийской батареи.

Так открыли свой счет снайперы. Потом в боевом донесении начальник штаба полка майор Гуляев напишет, что группа снайперов лейтенанта Белевича, девять дней и ночей не покидавшая своих окопов, истребила свыше пятидесяти гитлеровцев, в том числе более десяти офицеров, несколько наблюдателей, вывела из строя три пулеметных и два орудийных расчета.

— Память о тех трудных февральских днях — орден Отечественной войны II степени и медаль "За отвагу", —рассказывает Георгий Петрович. — Награду вручили не только мне, но и другим отличившимся снайперам.

Вторую медаль "За отвагу" Белевич получил за бои севернее Краснодара. В то время он командовал подразделением автоматчиков, наши части готовились к переходу в наступление. Командир дивизии генерал-майор Пияшев вызвал старшего лейтенанта Белевича и приказал ему с подразделением проникнуть в тыл противника, разгромить штаб вражеского соединения, нарушить линии связи.

В 6—7 километрах от передовой автоматчики отыскали штаб немецкой дивизии. Бесшумно сняв часовых, Белевич, лейтенант Клименко, другие воины перерезали телефонные линии. Автоматчики тем временем открыли огонь по выбегавшей из землянок охране штаба, поднятым с постелей перепуганным немецким офицерам.

На рассвете, когда выходили к своим, Белевича тяжело ранил немецкий снайпер разрывной пулей в левое плечо.

После госпиталя командир подразделения автоматчиков возвратился в свою воинскую часть. Вместе с боевыми друзьями — офицерами Клименко, Терешкиным, Фроловым и другими продолжал сражаться с фашистами. Получил две медали "За боевые заслуги".

— В Познани, в уличных боях смертью храбрых пал мой заместитель — старший лейтенант Иван Иванович Яровой, —рассказывает Георгий Петрович. — Отважный был человек. С его женой, родными и близкими, проживающими в Днепропетровске, продолжаю поддерживать связи. Много раз встречался с ними.

... Бывший фронтовик инвалид II-й группы подполковник в отставке Г. П. Белевич живет и работает в Минске. Принимает активное участие в военно-патриотическом воспитании молодежи.

Д. Писляков,
полковник в отставке,
инвалид ВОВ II-й группы

ГАЛАСЫ

У апошнія гады я шмат іх запісаў у свой пісьменніцкі сшытак. Маналогі гараджан і вяскоўцаў, маладых і пажылых людзей я чуў у электрычках і аўтобусах, у чэргах і на вуліцах, ад знаёмых і зусім не знаёмых людзей. У людскіх галасах у пэўнай меры адбіліся характары і лёсы маіх суразмоўцаў, іх спадзяванні і надзеі, роздум пра бачанае і чутае.

Спадзяюся, што запісаныя мною галасы знойдуць водгалас і ў сэрцах чытачоў.

Аўтар

А МАЕ ЎНУКІ ХІБА ГОРШЫЯ

— А што? Я — нічога! Дача, сад, соткі — ўсё норма. Склеп вылiў з цементу, какі-макі, што халадзільнік. Каб зімою свежую капусту прадаваць, вясною — яблыкі. Ды яшчэ пенсія. Усё баяўся, што не дачакаюся. Дачакаўся. Ну а цяпер, калі я на заслужаным адпачынку, дык дазвольце мне распарадзіцца ім, як мне хочацца. А хочацца так, каб і занятак быў блізкі сэрцу, і эканамічны інтарэс не кульгаў на дзве нагі. Мне ж шмат не трэба. Было б што на тулава накінуць ды на ногі насунуць. Але ўнукі ёсць, для іх трэба старацца, — бацька ж, сукін кот, кінуў іх. Значыцца, трэба гадаваць і вучыць іх так, каб дурнямі не былі. На іншых паглядзіш, хто хітрэйшы, рэпетытараў наймаюць, каб іх дзеткі не на двойкі, а на пяцёркі вучыліся. А мае ўнукі хіба горшыя? Не, вывяду іх у вучоныя людзі. Іншы раз мне кажуць: а хто будзе на полі і на заводзе рабіць? А тыя, пра каго бацькі не думаюць. Тыя самыя. А мае ўнукі будуць імі камандаваць. Начальнікі ж таксама патрэбны. Як без іх? Не, без начальства аніяк нельга. Дык няхай лепш мае будуць, чым суседскія. Ну, а да таго, як ім стаць начальнікамі, ох яшчэ доўгая песня. А адсюль, значыцца, мне трэба яшчэ гадкоў пятнаццаць, а то і дваццаць гарбаціць. Вось і стараюся, дарагі мой,як гаворыцца ў святым пісанні: у поце твару свайго здабываю хлеб свой надзённы. Вось гэтымі рукамі, без ніякай дапамогі. Так што будзьце спакойны, какі-макі...

ЖЫВУ, ЯК ХАЧУ

— Ну, і няхай! Няхай гавораць, што хочуць. Раней ад слёз задушылася б, а цяпер — не. Не я вінавата, што пайшло так жыццё. Хіба я хацела сабе горш? Зайздросцілі сяброўкі, што за Паўлюка выйшла. Ды яшчэ як! Агонь, а не хлопец! Прыгажун! Думала, да смерці будзем разам. А ён як пачаў з вяселля, так і не прасыхаў ні аднаго дня потым. Паўгода прайшло, а яму ўжо і не да мяне. Прыйдзе, упадзе пластом і дае храпака, лычом да сцяны. А прачнецца апоўначы, лезе. А ад яго, як ад свінні, смярдзіць. Хіба пра такое я думала? А так прыкідваўся, калі кавалерам быў: "Цярпець не магу. Толькі ў кампаніі. І не гарэлку, а салодзенькі квас п'ю". А выйшла — штодня піў. Дык нашто тады жаніўся? Піў бы сабе. Не лез бы. А то, бачыш, захацелася займець сям'ю. Жонку захацеў. Абрыдла аднаму цягацца, без дагляду. А тут, канешне, і абмыюць, і накормяць, і ў ложак пакладуць, прылашчаць. Спі, Паўлючок, спі, даражэнькі! І ўсё задарма, свіння смярдзючая! Таму і прагнала. А Васька чым лепшы? Ну піў мала, дык затое лежань з лежняў быў. Нічога ў гаспадарцы не хацеў рабіць. Цвік не забіў. "На тое і жонка, каб дома ўсё рабіць". Во як! Наймічка яму! Быццам нічога не зарабляю. Ды ў мяне, калі захачу, уся палучка можа застацца цэлая. У сталоўцы, ды быць галоднаю? Хо, калі б яшчэ піла, а то і кроплі ў рот не бяру. І не куру, як іншыя. Ды і ці багата адной трэба? Жыву цяпер, як хачу. Дваццаць шэсць гадоў, а ў лазні жанкі больш дваццаці не даюць. Свінні смярдзючыя, усё на віно і гарэлку памянялі. Трымаліся б, учапіўшыся ў спадніцу, за такую жонку, а яны...

Цьфу! І не трэба. Сама сабе гаспадыня. Куды хачу, туды і іду ці еду. А што плявузгаюць пра мяне — пляваць мне на іх! Ад зайздрасці ўсё!

М. Фаміч

РАДОК З БІЯГРАФІІ

НЯЛЁГКІМІ ЖЫЦЦЁВЫМІ ШЛЯХАМІ

Гэтага пажылога ўзросту мужчыну часта сустракаю на вуліцах гарадскога пасёлка Узда. Ён ніколі не цураецца людзей, кампанейскі. Міхаіл Іванавіч Безвадзіцкі 7 лістапада гэтага года будзе адзначаць свой 75-гадовы юбілей. Пражыта нямала, пройдзена нялёгкая жыццёвая дарога.

